В традиционных китайских цветах архитектурного декора много субъективных элементов. Древние китайские дизайнеры интерьеров умели использовать цвет для усиления художественно-образного воздействия дома, создавая в нем неповторимую атмосферу. Умелое использование светотени способствует более полному раскрытию и восприятию дома как целостного художественного произведения, а также выделению социального статуса его хозяина. Например, исключительно на крыше дворца используется желтая глазурь, в цветных картинах – золотые драконы и фениксы.

Как правило, для жилищ общий принцип нахождения разнообразия в единстве остается незыблемым. Цвета группы зданий, какими бы сложными и великолепными они ни были, всегда имеют основной, объединяющий тон. Так, дворцы в основном выполнены в красных и желтых (теплых) тонах в отличие от храмово-монастырского комплекса Храм Неба, который выполнен в основном в голубых и белых (холодных) тонах.

Но и при наличии колористического контраста цветовая гармония сохраняется, поскольку общий тон унифицирован. Поэтому многие дополнительные, вполне контрастные цвета, находящиеся в экстерьере и интерьере, делают их гармонизирующий тон более насыщенным и действенным.

1. *Чжоу, Минмин.* Школа архитектуры и городского планирования / Минмин Чжоу // Южная архитектура, Университет Чунцина. – 2006 (2). – № 2. – С. 116–119. – (на кит. яз.).

2. *Тао, Иншуан.* Китайский университет науки и технологий. Архитектура / Иншуан Тао. – Шаньси, 2015 (1). – С. 209–210. – (на кит. яз.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ФАРМІРАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ НАВУЧЭНЦАЎ У ВЫХАВАЎЧАЙ ПРАСТОРЫ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***К. І. Шык,***
*выкладчык кафедры рэжысуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў у выхаваўчай прасторы святочнай дзейнасці – гэта мадэль дабравольнага далучэння навучэнцаў да каштоўнасцей краіны, у якой яны пражываюць:

спосаб выхаваць патрыятычныя памкненні. Мадэль заснавана на прынцыпе вольнага выбару, калі навучэнец самастойна, без прымусу павышае ўзровень сваіх тэарэтычных і практычных ведаў аб родным краі, выхоўвае любоў і павагу да блізкіх людзей, асяроддзя ў цэлым, вучыцца шанаваць і захоўваць прыроду, берагчы гісторыка-культурныя каштоўнасці сваёй зямлі і абараняць яе. Тэорыя негвалтоўнага выхавання добра апісана нашымі і замежнымі даследчыкамі. Вучоныя В. М. Навумчык і М. А. Пазднікаў падкрэсліваюць, што «негвалтоўнасць – гэта перш за ўсё паводзіны, заснаваныя на ўяўленнях пра чалавека як вышэйшую каштоўнасць у шырокім сэнсе слова, гэта маральны прынцып, які вызначае міласэрнасць, цярпімасць, узаемаразуменне і спачуванне» [2, с. 75].

Святочная дзейнасць, як і любы іншы від дзейнасці, вызначаецца псіхалагічным зместам, у які ўключаюцца матывацыя, мэты, прадмет, сродкі, спосабы, прадукт і вынік. Недахоп многіх святочных дзей, накіраваных на патрыятычнае выхаванне, – у іх абмежаванні па формах і відах, змесце, унутраным насычэнні дзеі. Праблема заключаецца ў тым, што згодна з афіцыйнымі дакументамі, меркаваннямі многіх людзей, а таксама пэўных педагогаў, патрыятычныя святы – гэта Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці, 23 лютага і некаторыя іншыя падобнай накіраванасці. Патрыятызм у святах у сваёй большасці зводзіцца да ваеннай тэматыкі, што адлюстроўвае толькі адну яго грань.

Дадзеная мадэль патрыятычнага выхавання прапануе падыход, паводле якога ўсе святы маюць патрыятычную накіраванасць. Асноўная ідэя гэтай мадэлі выхавання патрыятызму – патрыятычная па змесце, цікавая па форме святочная дзея.

Мадэль грунтуецца на сістэматычным, аксіялагічным, дзейнасным, культуралагічным падыходах. Кожны з іх паспяхова вырашае вызначанае кола задач, але не вырашае праблемы ў цэлым, таму ўзнікла неабходнасць у іх узаемадапаўненні.

Мадэль уключае кагнітыўны, эмацыйна-пачуццёвы і дзейнасны кампаненты патрыятычнай праявы, якія трэба развіваць у навучэнцаў.

Інфармацыйны змест дадзенага працэсу рэалізуецца на аснове інтэграцыі блокаў ведаў аб гісторыі і культуры роднага краю і іншых дадзеных, якія маюць непасрэднае дачыненне да выхавання патрыятызму.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да асноўных напрамкаў дзейнасці святочных праграм мы адносім:

1. Фальклорны – накіраваны на развіццё традыцыйных каштоўнасцей у навучэнца. Можа прымяняцца як асобна (святы народнага календара, традыцыйныя абрады, фальклорныя вечарыны і г. д.), так і быць складовай часткай іншых святочных мерапрыемстваў.

2. Моўны – накіраваны на развіццё і пашырэнне беларускай мовы, добрага стаўлення да яе. Прымяняецца ва ўсіх святочных дзеях як мова сцэнарыя, вядучых і зносін. Мерапрыемствы накіраваны на папулярызацыю беларускай мовы.

3. Гістарычны – з'яўляецца неад'емнай часткай кожнага свята і абавязкова прывязаны да беларускай гісторыі, асобаў і іншых фактаў, якія маюць дачыненне да нашай краіны.

4. Культурны – спалучае ў сабе літаратуру, музыку, жывапіс і іншыя віды мастацтваў. Дадзены напрамак можа быць прыменены як у комплексе, так і асобна.

5. Спартыўны – развіццё фізічных здольнасцей навучэнцаў. На кожным свяце абавязкова павінен прысутнічаць спартыўны блок, і некалькі разоў на год павінны ладзіцца спартыўныя святы.

У працэсе святочнай дзейнасці неабходна ўзмацненне акцэнтаў на патэнцыял навучэнцаў, якія павінны рэалізаваць сябе яшчэ і як грамадзяне і патрыёты. У гэтым выпадку змястоўнае забеспячэнне інфармацыйнай базы свята павінна стварыць аснову такой педагагічнай дзейнасці ў сувязі з рашэннем перш за ўсё задач па фарміраванні патрыятызму.

Сродкам матывацыі навучэнцаў у патрыятычнай дзейнасці з'яўляецца змястоўнае і арганізацыйнае забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі да святаў і ўдзелу ў іх.

Эфектыўнасць арганізацыі працэсу святочнай дзейнасці выяўляецца ва ўменні педагога забяспечыць патрыятычнае фарміраванне асобы навучэнца ў адпаведнасці з мэтай і задачамі яго ўсебаковага развіцця. Дзейнасць – галоўная ўмова.

Фарміраванне патрыятызму навучэнцаў у выхаваўчай прасторы святочнай дзейнасці вызначае неабходнасць уліку яе сацыяльнага і педагагічнага аспектаў. Дзякуючы ўліку сацыяльнага аспекту свята, мадэль выбудоўваецца з неабходным прадстаўленнем таго, што павінна быць. Педагагічны аспект звязаны з асаблівасцямі арганізацыі выхаваўчага працэсу святочнай дзейнасці. Дзякуючы ўліку педагагічнага аспекту мы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміруем уяўленне пра тое, як і якімі сродкамі забяспечыць працэс патрыятычнага выхавання ў святочнай дзейнасці.

Кагнітыўны кампанент мадэлі патрыятычнага выхавання павінен быць структураваны на аснове вылучэння па пэўных блоках, тэматыцы. Структура будзе сістэмнай пры ўмове, калі вызначаныя кампаненты, іх сувязі змогуць забяспечыць цэласнасць зместу дадзенага працэсу, а рэалізацыя святаў створыць перадумовы для эфектыўнай педагагічнай дзейнасці.

Неабходна спалучаць кіруючую ролю педагогаў-арганізатараў з усебаковым развіццём асобы, яе актыўнасцю і самастойнасцю, звязваючы святы з самавыхаваннем. Як вядома, самавыхаванне – гэта свядомая і несвядомая дзейнасць чалавека, якая вызначаецца вядучымі асабістымі меркаваннямі, якія ўзнікаюць у працэсе сацыялізацыі і выхавання, накіраваная на ўдасканаленне сябе як асобы, суб’екта сацыялізацыі [1, с. 198].

Кожнае мерапрыемства ўключае падрыхтоўчы, арганізацыйны, асноўны і заключны этапы.

На падрыхтоўчым этапе вызначаецца свята, якое будзе праводзіцца, абмяркоўваюцца яго актуальнасць, тэма, ідэя, задачы і звышзадача.

На арганізацыйным этапе вызначаюцца рэжысёрска-пастановачная група, склад аргкамітэта, матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне, рыхтуецца сцэнарый.

На асноўным этапе адбываецца інфармаванне аб свяце, ствараецца святочная атмасфера: праводзяцца вытворча- і мастацкаконкурснай накіраванасці мерапрыемствы, работа над архітэктурна-дэкаратыўным афармленнем свята, увасабленнем святочнага дзеяння і г. д.

На заключным этапе падводзяцца вынікі і адбываецца рэфлексія.

У сваю чаргу, навучэнцы падчас святочнай дзейнасці праходзяць шэсць этапаў.

На першым – яны знаёмяцца з гісторыяй пэўнага свята, абмяркоўваюць свой далейшы ўдзел.

На другім этапе пачынаецца непасрэдная падрыхтоўка да свята, на якім педагогам разам з навучэнцамі ствараецца сцэнарый свята, які ўключае загадзя адабраны літаратурны і музычны матэрыял.

На трэцім этапе, калі сцэнарый ужо падрыхтаваны, вызначаецца роля кожнага навучэнца падчас падрыхтоўкі і правядзен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня свята (запрашэнне і інфармаванне, творчыя нумары, тэхнічная і іншая дапамога).

На этапе рэпетыцыі пачынаецца непасрэдная праца па начытванні літаратурнага сцэнарыя, песень, пастаноўцы танцаў, афармленні залы, вулічных пляцовак, паркаў і г. д., вырабе аксэсуараў да касцюмаў. Працягваецца праца над сцэнарыем: уносяцца змены і карэктывы, якія ўзнікалі падчас працы.

Этап правядзення свята.

Рэфлексійна-ацэначны этап – выніковы, на якім трэба вучыцца рэфлексаваць (аналізаваць) уласную дзейнасць, ацэньваць яе, супастаўляючы вынікі з пастаўленымі асноўнымі і прыватнымі задачамі (мэтамі). Як вядома, памяць доўга захоўвае светлыя, радасныя, яскравыя ўражанні, якімі багата свята, і задача педагогаў на дадзеным этапе – «прывязаць» да гэтых успамінаў тыя ўменні, навыкі і веды, што навучэнцы атрымалі на свяце і падчас яго падрыхтоўкі. Для гэтага праводзяцца тэматычныя гутаркі, круглыя сталы, калі навучэнцы могуць выказаць свае прапановы і заўвагі, вылучыць найбольш важнае і галоўнае ў свяце, патлумачыць цікавыя і незразумелыя моманты. На гэтым этапе замацоўваюцца найбольш змястоўныя і маляўнічыя ўражанні, звязаныя з тэматыкай свята, якія захоўваюцца ў памяці, фатаграфіях, відэазапісах і г. д. Працу па падвядзенні вынікаў пройдзенага свята неабходна арганізаваць так, каб навучэнцы маглі атрымаць пачуццё эмацыйнага задавальнення, радасць перамогі, шчасце пазнання новага, цікавага. Тым самым будзе фарміравацца арыентацыя на перажыванні такіх пачуццяў у будучыні, што прывядзе да патрэбнасці ў творчасці, пазнанні, ва ўпартай самастойнай рабоце, г. зн. да з'яўлення станоўчай устойлівай матывацыі да патрыятычных праяў, пра якія навучэнцы могуць нават не здагадвацца. Галоўная задача педагога – не звяртаць увагу навучэнцаў на тое, што ідзе пэўны педагагічны працэс, а ўскосна зразумець, ці абагаціліся яны якасцямі, уласцівымі для патрыётаў. Мэтазгодна выкарыстоўваць разнастайныя метады і прыёмы, якія даюць магчымасць праявіць навучэнцам самастойнасць і ініцыятыву.

Напрыклад, можна даць наступныя заданні: скласці схему (мадэль) пройдзенага свята, у якой выявіліся яго асноўныя паняцці, ідэі і сувязі паміж імі (хатняе заданне могуць выконваць групы па 3–5 чалавек).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералічыць пытанні і задачы, па якіх можна праверыць узровень засваення ведаў (падвядзенне вынікаў можна правесці ў выглядзе ток-шоў, на якім некаторыя навучэнцы выступяць з аглядннымі дакладамі па асобных аспектах свята з наступным калектыўным абмеркаваннем гэтых дакладаў).

Для выхавання ўменняў ацэньваць сваю працу, дарэчы даць заданне.

1. Пералічыце асноўныя пытанні, закранутыя на пэўным свяце, і пазначце побач, як вы гэтыя пытанні, на вашу думку, засвоілі: добра, не вельмі добра, не засвоілі.

2. Пералічыце ўменні, якія вы набылі пры ўдзеле ў свяце, і пакажыце, як вы асвоілі кожнае з іх: добра, слаба, не засвоілі.

Далей неабходна правесці абмеркаванне свята з мэтай выпрацоўкі адэкватнай самаацэнкі святочнай дзейнасці, для высвятлення прычын прабелаў і патрэбаў да іх ліквідацыі. Важна, каб кантроль і ацэнка выкарыстоўваліся для заахвочвання да далейшага ўдзелу ў святочнай дзейнасці, стварэння перспектыў фарміравання патрыятычных праяў.

Кожны месяц абавязкова праводзіць мерапрыемствы як мінімум па чатырох з пяці магчымых напрамкаў. Блокі павінны фарміравацца так, каб пэўныя аднолькавыя тэмы не надакучвалі, а былі вельмі цікавымі і разнастайнымі, каб навучэнцы маглі ўбачыць усё хараство Беларусі праз святочную дзейнасць, «падцягнуць» свае веды па гісторыі і мове, мастацкай культуры, праявіць асабістыя фізічныя здольнасці, атрымаць дадатковыя веды і ацаніць той факт, што яны нарадзіліся, жывуць, вучацца і будуць працаваць менавіта ў Беларусі.

---

1. *Наумчик, В. Н.* Воспитание свободой: теория и практика альтернативной педагогики / В. Н. Наумчик. – Минск : Четыре четверти, 2005. – 200 с.

2. *Наумчик, В. Н.* Воспитание трудных детей: Теория. Практика. Эксперимент : пособие для учителей, воспитателей, студентов, магистрантов, аспирантов пед. высш. учеб. заведений / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2013. – 472 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ